# Стратэгія рэалізацыі падтрымкі Беларусі з боку Швецыі на перыяд  2011-2014 гг.

UD
UTRIKESDEPARTEMENTET • MINISTRY FOR FOREIGN AFFAIRS, SWEDEN •



REGERINGSKANSLIET
Government Offices of Sweden

**Стратэгія рэалізацыі падтрымкі Беларусі з боку Швецыі на перыяд 2011-2014 гг.**

## УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з захаваннем прынцыпаў дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі вельмі сур'ёзная, і яна яшчэ пагоршылася ў сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі ў снежні 2010 года. Тое, як выбары былі праведзены, і рэпрэсіі, ахвярамі якіх сталі прадстаўнікі апазіцыі, незалежных медыя і грамадзянскай супольнасці пасля іх, істотна адкінула назад працу, накіраваную на развіццё дэмакратыі і павагі да правоў чалавека.

У сувязі з гэтым міністры замежных спраў ЕС у студзені 2011 года вырашылі аднавіць і пашырыць санкцыі супраць некаторых прадстаўнікоў кіраўніцтва Беларусі. ЕС патрабуе, каб Беларусь, у якасці першага кроку, адпусціла і рэабілітавала ўсіх палітычных зняволеных і пачала адназначна рухацца ў напрамку ўсталявання дэмакратыі і павагі да правоў чалавека. Калі гэта не будзе зроблена, ЕС пакідае за сабой права рабіць далейшыя захады. У той жа час, ЕС плануе пашырыць свае абавязацельствы перад беларускім насельніцтвам, напрыклад, праз спрашчэнне паездак праз мяжу і павелічэнне падтрымкі грамадзянскай супольнасці.

У доўгатэрміновых інтарэсах Швецыі і ўсёй Еўропы ператварэнне Беларусі ў сучасную, палітычна плюралістычную і дэмакратычную дзяржаву, заснаваную на прынцыпах павагі да закону і правоў чалавека, з эканамічна і экалагічна ўстойлівым грамадствам.

У выніку шматгадовай і шматвектарнай працы Швецыі ў Беларусі ў галіне развіцця, быў напрацаваны каштоўны досвед і створаны важныя сувязі, якія могуць быць карыснымі. Зараз шведская падтрымка будзе сканцэнтравана на трох асноўных накірунках: I) дэмакратыя, правы чалавека і гендэрная роўнасць; II) навакольнае асяроддзе; III) развіццё рынкавай эканомікі; каб у перыяд дзуяння стратэгіі засяродзіць намаганні на тых галінах, дзе Швецыя мае значную канкурэнтную перавагу.

Па-ранейшаму застаецца вельмі высокая патрэба ў рэформах у такіх галінах, як дэмакратыя, правы чалавека і гендэрная роўнасць. Значных рэформаў патрабуюць прыватны сектар і сектар навакольнага асяроддзя, уключна з ачысткай вады і развіццём прадпрымальніцтва. Швецыя непасрэдна зацікаўленая таксама ў стварэнні ў Беларусі экалагічна ўстойлівага грамадства, бо краіна - блізкі сусед па рэгіёне Балтыйскага мора. Рэформы такога кшталту часта патрабуюць супрацоўніцтва паміж

прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці і ўрадавых устаноў, а ў гэтым пытанні Швецыя лічыцца перадавой краінай.

На бягучы момант падтрымка дэмакратычнага развіцця і грамадзянскай супольнасці стаіць перад сур'ёзнымі выклікамі, паколькі шмат хто з вядучых прадстаўнікоў, што працуюць у гэтых напрамках, затрыманыя, а мноства арганізацый маргіналізаваныя. Пагаршэнне адносінаў паміж ЕС і беларускімі ўладамі яшчэ больш ўскладняе магчымасці працы ў краіне для арганізацый з замежжа. Аднак і раней заканадаўства і бюракратыя з іх складанымі працэдурамі рэгістрацыі паказвалі, наколькі мала зацікаўлены ўлады Беларусі ў замежнай падтрымцы ў гэтай галіне.

Сярод прадстаўнікоў Швецыі, якія працуюць з Беларуссю, існуе разуменне таго, што ў дадзенай сітуацыі надзвычай важна пазбегчы ізаляцыі насельніцтва краіны і захоўваць ды паглыбляць сувязі з тымі прадстаўнікамі Беларусі, якія арыентаваны на змены, для таго, каб спрыяць з'яўленню больш плюралістычнага і адкрытага грамадства. Асаблівы прыярытэт павінен быць нададзены дэмакратычным захадам з боку моладзі, студэнтаў і іншых грамадзян, якія імкнуцца да зменаў.

З улікам усяго вышэйсказанага, шведская дапамога, у першую чаргу, будзе вылучацца на падтрымку арыентаваных на змены прадстаўнікоў беларускага грамадства.

Швецыя будзе дамагацца шырокага дыялогу з беларускім грамадствам і супрацоўнічаць з прадстаўнікамі як грамадзянскай супольнасці, так і ўрадавых устаноў, дзе гэта пажадана і магчыма, пераважна на мясцовым і рэгіянальным узроўнях, з мэтай паляпшэння перспектываў далейшых рэформаў у грамадстве ў цэлым. У сённяшняй сітуацыі кантакты з уладамі на цэнтральным узроўні мусяць быць абмежаванымі.

Падтрымка будзе аказвацца той дзейнасці, якая спрыяе пашырэнню грамадскага і палітычнага плюралізму. Трэба весці дыялог па пытаннях дэмакратычнага кіравання, перспектываў больш цеснага збліжэння з ЕС і ягонымі фундаментальнымі каштоўнасцямі, а таксама наконт будучага ўдзелу ў двухбаковай частцы Усходняга партнёрства пры выкананні неабходных для гэтага патрабаванняў.

Шведская дапамога Беларусі ў перыяд з 2011 г. па 2014 г. будзе кіравацца дадзенай стратэгіяй. Аб'ём выдаткаваных сродкаў на працягу названага перыяду можа дасягнуць 120 мільёнаў шведскіх крон у год.

Агульнай мэтай шведскай дапамогі Беларусі будзе дэмакратычнае развіццё, якое асноўваецца на павазе да правоў

чалавека, большай ахове навакольнага асяроддзя, стварэнні ўмоваў для развіцця рынкавай эканомікі, і збліжэнне з Еўрапейскім Саюзам.

Пасля заканчэння паловы вызначанага перыяду магчымы перагляд дадзенай стратэгіі.

## 1. Агульныя мэты і прыярытэты: мэты і прыярытэты эфектыўнай рэалізацыі падтрымкі, агульныя пытанні для дыялогу

***Агульныя мэты і прыярытэты***

Агульнай мэтай дапамогі Беларусі будзе дэмакратычнае развіццё, якое асноўваецца на павазе да правоў чалавека, большай ахове навакольнага асяроддзя, стварэнні ўмоваў для развіцця рынкавай эканомікі і збліжэнні з Еўрапейскім Саюзам.

Такі падыход садзейнічае дасягненню мэтаў супрацоўніцтва Швецыі ў галіне рэформ ва Усходняй Еўропе, напрыклад, умацаванню дэмакратыі, справядліваму і ўстойліваму развіццю, а таксама збліжэнню з Еўрапейскім Саюзам і яго фундаментальнымі каштоўнасцямі. Гэта таксама адпавядае агульнай мэце шведскай палітыкі глабальнага развіцця - дасягненню справядлівага і ўстойлівага развіцця. Тры тэматычныя прыярытэты шведскага ўраду - дэмакратыя і правы чалавека, навакольнае асяроддзе і клімат, а таксама гендэрная роўнасць і роля жанчын у развіцці – павінны таксама ўлічвацца ў рэалізацыі стратэгіі. Акрамя таго, развіццё разглядаецца таксама з пункту гледжання сацыяльнай справядлівасці і ўліку інтарэсаў маламаёмых слаёў насельніцтва. Праца Швецыі будзе накіравана на заахвочванне ўдзелу грамадзян у жыцці грамадства, захаванне прынцыпаў гендэрнай роўнасці, адкрытасці, справаздачнасці уладаў і ўмацаванне ролі грамадзянскай супольнасці ва ўсіх галінах.

***Мэты і прыярытэты эфектыўнай рэалізацыі падтрымкі***

Галоўнай мэтай і прыярытэтам з'яўляецца паляпшэнне каардынацыі паміж донарамі і больш актыўны ўдзел грамадзянскай супольнасці Беларусі ў праектах і праграмах.

У святле пагаршэння палітычнага клімату многія донары абвясцілі свае планы павелічэння падтрымкі Беларусі, асабліва ў галінах дэмакратыі і правоў чалавека. Каардынацыя паміж Швецыяй і іншымі донарамі становіцца ўсё больш важнай для забеспячэння эфектыўнай реалізацыі дапамогі, таму яна будзе працягнута і пашырана. У значнай ступені донары ў Беларусі каардынуюць свае намаганні нефармальна, і Швецыя, якая

з'яўляецца адным з найбуйнейшых двухбаковых донараў у Беларусі, павінна адыгрываць у гэтым працэсе актыўную ролю.

Акрамя таго, Швецыя будзе імкнуцца, каб арганізацыі грамадзянскай супольнасці бралі актыўны ўдзел у праграмах донарскай падтрымкі. Належная ўвага павінна быць нададзена праграмнаму (сектарнаму) падыходу, асабліва ў выпадку супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю. Перспектывы прыняцця такога падыходу ў адпаведнасці з прынцыпамі Парыжскай дэкларацыі аб эфектыўнасці знешняй дапамогі абмежаваны з-за недастатковага жадання ўладаў Беларусі да гэтага часу праводзіць рэформы, неабходныя для набліжэння краіны да ЕС і рынкавай эканомікі.

***Агульныя пытанні для дыялогу***

Дыялог аб важнасці дэмакратычнага кіравання краінай і аб перспектывах большага набліжэння да Еўрапейскага Саюза і яго фундаментальных каштоўнасцяў, у тым ліку пытанні будучага ўдзелу ў двухбаковай частцы Усходняга партнёрства, павінен усталёўвацца і падтрымліваецца як з грамадзянскай супольнасцю так і, калі пажадана і/ці магчыма, з дзяржаўнымі ўстановамі.

Тры тэматычныя прыярытэты ўрада (дэмакратыя і правы чалавека, навакольнае асяроддзе і клімат, а таксама гендэрная роўнасць і роля жанчын у развіцці) павінны разглядацца як зыходныя пункты для няспыннага дыялогу з беларускімі партнёрамі.

## 2. Сектары

***Сектар 1: Дэмакратыя, правы чалавека і гендэрная роўнасць***

*Мэты сектара:*

- Большая інфармаванасць пра фундаментальныя дэмакратычныя каштоўнасці і правы чалавека ды павага да іх і лепшае разуменне гендэрных пытанняў у беларускім грамадстве.

*Накірункі:*

Каб дамагчыся гэтай мэты, Швецыя будзе аказваць падтрымку развіццю грамадзянскай супольнасці і яе суб'ектаў, спрыяць супрацоўніцтву паміж імі і дапамагаць актывізаваць дыялог паміж гэтымі суб'ектамі і ўладамі з тым, каб спрыяць з'яўленню больш плюралістычнай грамадзянскай супольнасці.

Шведская падтрымка будзе аказвацца грамадзянскай супольнасці ў такіх галінах, як дэмакратыя і правы чалавека, гендэрная роўнасць, СМІ і культура. Прыярытэтнай павінна стаць

падтрымка міжнародных абменаў для моладзі і студэнтаў. Развіццё патэнцыялу партнёрскіх арганізацый стане таксама адным з ключавых элементаў у падтрымцы грамадзянскай супольнасці, але гэта будзе заснавана, наколькі магчыма, на патрэбах і попыце і ўяўляць сабой неад'емную частку дзейнасці партнёра.

Швецыя павінна стымуляваць актыўны ўдзел беларусаў у палітычных працэсах і ў рашэнні разнастайных грамадскіх пытанняў, напрыклад, праз прадастаўленне адукацыйнай падтрымкі і падтрымкі мясцовых назіральнікаў за выбарамі, а таксама падтрымкі працэсу абароны правоў чалавека. Могуць быць разглежаныя меры, якія дапамогуць пашырыць колькасць і сферы кантактаў паміж шведскім і беларускім бакамі, прыкладамі могуць быць жыллёвыя і жаночыя асацыяцыі, гандлёвыя палаты і прадпрымальніцкія, экалагічныя ды моладзевыя арганізацыі.

На двухбаковай аснове і ў супрацоўніцтве з іншымі донарамі Швецыя будзе дапамагаць незалежным медыя, у прыватнасці шляхам падтрымкі перадачы навін, у тым ліку і на інтэрнет парталах, навучання журналістаў і праз журналістскія абмены. Швецыя таксама будзе супрацоўнічаць з аб’яднаннямі незалежных сродкаў масавай інфармацыі і самімі незалежнымі сродкамі масавай інфармацыі ў мэтах умацавання медыя-сектара і дапамогі яму стаць больш разнастайным і прафесійным. Падтрымка можа быць даступная і для прапаноў у рамках інфармацыйных ды камунікацыйных тэхналогій (ІКТ), якія ўмацоўваюць дэмакратыю.

Шведская дапамога павінна спрыяць гендэрнай роўнасці. Неабходна ажыццяўляць мэтанакіраваныя дзеянні, распрацаваныя для развіцця разумення і пашырэння інфармаванасці пра пытанні гендэрнай роўнасці, нараўне з дзеяннямі па барацьбе з гендэрным насіллем.

Швецыя будзе імкнуцца падтрымліваць тых, хто зацікаўлены ў зменах на розных узроўнях беларускага грамадства, уключна з мясцовым ды рэгіянальным адміністратыўным узроўнямі, праз развіццё патэнцыялу партнёрскіх арганізацый і міжнародныя абмены. Кантакты з цэнтральнымі органамі ўлады павінны праводзіцца ў абмежаваным маштабе, пакуль палітычныя передумовы не палепшацца.

*Супрацоўніцтва з іншымі донарамі:*

Шведская праца ў галіне рэформаў павінна ажыццяўляцца ў цесным супрацоўніцтве з іншымі донарамі, асабліва Еўрапейскай Камісіяй. Агульны аб'ём дапамогі ў мэтах развіцця для Беларусі плануецца павялічыць. Для таго, каб дапамогу зрабіць больш дзейснай, надзвычай патрэбна каардынацыя намаганняў з

донарамі-адзінадумцамі.  Калі гэта карысна і магчыма, варта шукаць партнёрства з іншымі краінамі.

Супрацоўніцтва з такімі партнёрамі, як Рада Еўропы, Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ), Рада міністраў Паўночных краін і Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, вітаецца, і надалей такое супрацоўніцтва можа развівацца.

У выніку палітычнай сітуацыі ў краіне многія донары ў апошнія гады абмежавалі свае праграмы падтрымкай грамадзянскай супольнасці і гуманітарнай дапамогай.

***Сектар  2: Навакольнае асяроддзе***

*Мэты сектара:*

1. Распрацоўка і прыняцце ў Беларусі заканадаўства і адпаведных інструкцый ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, якія адпавядаюць дырэктывам ЕС і абавязацельствам краіны згодна з міжнароднымі канвенцыямі.
2. Зніжэнне шкодных выкідаў у атмасферу, глебу і ваду.

*Накірункі:*

Каб дамагчыся першай мэты, Швецыя будзе падтрымліваць меры, арыентаваныя на інстытуцыйнае развіццё і развіццё патэнцыялу арганізацый на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях, гарманізацыю нацыянальнага і еўрапейскага заканадаўстваў, і адаптацыю як да дырэктываў ЕС, так і да абавязацельстваў, прадугледжаных міжнароднымі канвенцыямі ў дачыненні да пытанняў трансмежнага клімату і экалагічных праблем. Шведская падтрымка павінна пашырыць магчымасці адпаведных органаў улады падрыхтавацца і, дзе можна, ажыццявіць паляпшэнні ў галіне навакольнага асяроддзя, зыходзячы з вышэй адзначаных абавязацельстваў і пасля кансультацый з грамадзянскай супольнасцю.

Развіццё патэнцыялу партнёрскіх арганізацый стане ключавым элементам шведскай падтрымкі грамадзянскай супольнасці, але такая падтрымка будзе заснавана, наколькі магчыма, на патрэбах і попыце і ўяўляць сабой неад'емную частку дзейнасці партнёра.

Шведская падтрымка накіравана на развіццё дыялогу і супрацоўніцтва паміж суб'ектамі грамадзянскай супольнасці і дзяржаўнымі ўстановамі і на садзейніцтва каардынацыі як паміж міністэрствамі з абавязкамі ў галіне навакольнага асяроддзя, так і паміж цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі.

Для дасягнення другой мэты шведская дапамога павінна быць накіравана як на адаптацыю дзяржаўнай палітыкі і заканадаўства,

так і на наўпроставую падтрымку інвестыцый. Чакаецца, што інвестыцыйная падтрымка будзе накіравана на муніцыпальную экалагічную інфраструктуру і, у першую чаргу, каб дапамагчы паменшыць забруджванне Балтыйскага мора. Галоўнай мэтай павінна быць дапамога ў памяншэнні сцёку ўгнаенняў і пестыцыдаў у рамках Балтыйскай праграмы дзеянняў. Падчас пераходнага перыяду інвестыцыі могуць фінансавацца часткова за кошт грантаў у спалучэнні з пазыкамі з боку міжнародных фінансавых устаноў.

Інвестыцыйныя меры павінны ў першую чаргу ажыццяўляцца ў супрацоўніцтве з міжнароднымі фінансавымі ўстановамі, якія ўдзельнічаюць у Экалагічным партнёрстве Паўночнага вымярэння (ЭППВ), у якім Беларусь мае статус назіральніка з лістапада 2009 года. Падтрымка будзе ахопліваць інстытуцыйнае развіццё, тэхнічныя кансультацыі, а таксама пастаўкі механічнага і электрычнага абсталявання. Магчыма таксама прадаставіць фінансаванне Фонду падтрымкі ЭППВ для аказання дапамогі ў Беларусі.

Мэтай шведскай падтрымкі з’яўляецца дапамога ў павышэнні ўзроўню свядомасці і ангажаванасці ў галіне экалагічных пытанняў шляхам дыялогу на розных узроўнях грамадства і паміж арганізацыямі і органамі дзяржаўнай улады. Ініцыятывы, якія датычацца інфармацыі, камунікацыі і адукацыі ў галіне навакольнага асяроддзя, а таксама аказання дапамогі экалагічным арганізацыям, павінны быць падрыхтаваны ў дыялогу з іншымі ўдзельнікамі.

Для дасягнення другой мэты Швецыя будзе падтрымліваць меры, якія зніжаюць спажыванне энергіі і знаёмяць з новымі тэхналогіямі ў сферы водазабеспячэння і ачышчэння сцёкавых водаў, кіравання адходамі і ў сектары цэнтралізаванага цеплазабеспячэння.

Падтрымка сектара навакольнага асяроддзя павінна быць ясна звязаная з гатоўнасцю беларускага боку да рэформаў.

*Супрацоўніцтва з іншымі донарамі:*

Неабходна пашыраць супрацоўніцтва з Паўночным інвестыцыйным банкам (ПІБ), Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР), Паўночнай экалагічнай фінансавай карпарацыяй (ПЭФК) і ЭППВ.

***Сектор 3: Развіццё рынку***

*Мэты сектара:*

1. Паляпшэнне магчымасцяў для правядзення эканамічных рэформаў.

2. Паляпшэнне ўмоваў для развіцця сярэдняга і дробнага бізнесу.

*Накірункі:*
Для дасягнення першай мэты і як толькі неабходныя ўмовы будуць выкананыя, шведская падтрымка павінна засяродзіцца на дапамозе па стварэнні асяроддзя, якое палегчыць і паскорыць пераход да эфектыўнай рынкавай эканомікі. Цягам рэалізацыі стратэгіі будуць разгледжаны і магчымасці для падтрымкі адаптацыі Беларусі да заканадаўства ЕС. Такая падтрымка можа ўключаць, напрыклад, гарманізацыю рэгулявання. Можа вывучацца таксама магчымасць нарошчвання патэнцыялу ў падтрымку працэсу далучэння Беларусі да СГА.

Падтрымка можа ахапіць працэсы рэформаў, накіраваных на змяншэнне бюракратычных перашкод і паляпшэнне ўмоў для дробнага і сярэдняга бізнесу, а таксама меры, накіраваныя на тое, каб зрабіць беларускі інвестыцыйны і дзелавы клімат больш адкрытым і прадказальным, што палегчыла б шлях да пашырэння гандлю і інвестыцый.

Шведская дапамога таксама будзе садзейнічаць развіццю дыялогу і супрацоўніцтва паміж незалежнымі арганізацыямі бізнесу, адукацыйнымі і даследчымі інстытутамі і дзяржаўнымі ўстановамі.

Для дасягнення другой мэты шведская падтрымка будзе спрыяць палепшэнню умоваў для развіцця дробнага і сярэдняга прыватнага бізнесу і, тым самым, садзейнічаць таму, каб людзям было лягчэй далучацца, прымаць удзел і атрымліваць выгаду ад працэсу эканамічнага росту. Можа разглядацца таксама і падтрымка стварэння і развіцця прыватных банкаў і крэдытных інстытутаў.

Падтрымліваючы развіццё патэнцыялу партнёрскіх арганізацый, Швецыя будзе садзейнічаць бізнесу ў яго намаганнях па самаарганізацыі і спробах дзейнічаць як група, і таксама наладжванню кантактаў са Швецыяй і іншымі краінамі.

Падтрымка сектара рынкавай эканомікі павінна быць ясна звязаная з гатоўнасцю беларускага боку да рэформаў.

*Супрацоўніцтва з іншымі донарамі:*

Супрацоўніцтва з такімі партнёрамі, як Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР), Сусветны банк / Міжнародная фінансавая карпарацыя (IFC), Міжнародны валютны фонд (МВФ) і Еўрапейская камісія, можа быць пашырана.

## 3. Аб’ём падтрымкі

Аб'ём падтрымкі, якую Швецыя плануе вылучыць Беларусі, можа дасягнуць прыблізна 120 мільёнаў шведскіх крон у год на працягу перыяду з 2011 па 2014 гг.

## 4. Кіраванне рызыкамі

Павелічэнне шведскага ўнёску ў развіццё сектараў дэмакратыі, правоў чалавека і гендэрнай роўнасці стрымліваецца абмежаванай колькасцю арганізацый-партнёраў, якія здольныя ажыццяўляць вялікія аб'ёмы дзейнасці і адпавядаць бухгалтарскім патрабаванням і патрабаванням па справаздачнасці, асабліва з улікам павелічэння дапамогі, якую абвясцілі іншыя донары ў адказ на палітычную сітуацыю. Гэта стварае пэўныя выклікі для эфектыўнага ажыццяўлення дапамогі і азначае, што працяг і ўзмацненне каардынацыі паміж Швецыяй і іншымі донарамі стануць яшчэ больш істотнымі.

Каб мінімізаваць рызыкі, трэба прымяняць прагматычны і гнуткі падыход да супрацоўніцтва ў трох абраных сектарах і ў існуючым палітычным кантэксце.

Сёння Беларусь сутыкаецца са значнымі палітычнымі, эканамічнымі і сацыяльнымі выклікамі. Эканамічныя падзеі ў краіне паказваюць, што як буйныя інвестыцыі, так і рэформы вельмі неабходныя. МВФ і Сусветны банк асабліва адзначылі неабходнасць памяншэння ролі дзяржавы ў эканоміцы праз прыватызацыю, больш шырокія магчымасці па свабодным коштаўтварэнні і ўсталяванні заработнай платы і рэформу фінансавага сектара. Беларускія ўлады, тым часам, не прадэманстравалі жадання лібералізаваць грамадства або рэфармаваць у значнай ступені кантраляваную дзяржавай эканамічную мадэль краіны.

Такім чынам, дадатковай пагрозай для рэалізацыі стратэгіі ў сектарах навакольнага асяроддзя і развіцця рынку з'яўляецца нежаданне беларускіх уладаў праводзіць рэформы і станавіцца больш арыентаванымі на рынак. Хоць існуюць і патрэба, і патэнцыял, аднак неабходнай перадумовай аказання падтрымкі павінны быць шырокія рэформы. Адным з прыкладаў рэформаў можа служыць перагляд сістэмы тарыфаў. Вось чаму шведская падтрымка развіцця супрацоўніцтва павінна быць абумоўлена гатоўнасцю беларускага боку да рэформаў.

Карупцыя перашкаджае дэмакратычнаму развіццю, менавіта таму барацьба з карупцыяй павінна пранізваць усю дзейнасць у рамках

шведскіх праграм дапамогі. Неабходнасць прадухілення і барацьбы з карупцыяй павінна быць інтэграваная ва ўсе меры. Жыццёва важна стварыць эфектыўную сістэму кантролю і падсправаздачнасці і забяспечыць няспынны маніторынг. Карупцыйныя рызыкі ў сувязі з аказаннем шведскай дапамогі заўсёды павінны быць прааналізаваныя, і, пры неабходнасці, магчыма прыняцце спецыяльных мер па стрыманні карупцыі.

У святле няпэўнай палітычнай сітуацыі, магчыма, узнікне неабходнасць перагляду стратэгіі пасля заканчэння паловы перыяду яе рэалізацыі.

**5. Адпаведнасць**

Беларусь не мае пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве з ЕС і не ўдзельнічае ў двухбаковай частцы Усходняга партнёрства. ЕС плануе павялічыць сваю падтрымку грамадзянскай супольнасці цягам бліжэйшых некалькіх гадоў. Таксама разглядаюцца магчымасці для двухбаковага супрацоўніцтва паміж гарадамі і ўстановамі. У цяперашні час у рамках ЕС рыхтуюцца пагадненні паміж ЕС і Беларуссю па спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі.

Швецыя імкнецца як на двухбаковай аснове, так і праз ЕС пашырыць магчымасці для развіцця дэмакратыі ў Беларусі і прадухіліць ізаляцыю насельніцтва. Двухбаковая падтрымка Швецыі пытанняў дэмакратыі, правоў чалавека, грамадзянскай супольнасці, эканамічна і экалагічна ўстойлівага развіцця, пашырэння міжнародных кантактаў беларусаў - не ў апошнюю чаргу маладых людзей і студэнтаў - усё гэта адпавядае запланаванай падтрымцы ЕС. Адносіны паміж Беларуссю і ЕС цягам доўгага часу былі адносна абмежаванымі, за выключэннем апошніх гадоў, калі беларускія ўлады паказалі пэўнае жаданне рэформаў і гатоўнасць да дыялогу. Пасля прэзідэнцкіх выбараў у снежні 2010 года, аднак, адносіны зноў пагоршыліся, і пакуль яшчэ занадта рана меркаваць, як гэта паўплывае на ажыццяўленне праграм дапамогі.

Супрацоўніцтва Швецыі з Беларуссю ў галіне рэформаў адбываецца ўжо на працягу даволі доўгага часу, і, як вынік, колькасць кропак судотыку паміж краінамі няўхільна расце. Падаецца, што існуе ўзаемная і растучая зацікаўленасць з боку грамадзянскай супольнасці абедзвюх краін да супрацоўніцтва ў некаторых з пералічаных вышэй накірунках, а таксама, хоць і ў меншай ступені, з боку ўрадавых устаноў, у галінах, якія тычацца гандлю, навакольнага асяроддзя і эканамічнай лібералізацыі.

Цягам шэрагу гадоў Шведскі Інстытут актыўна працуе ў Беларусі для ўмацавання дэмакратычнай культуры, адкрытасці і інавацый

шляхам абменаў і партнёрства ў сферы культуры і грамадскага жыцця. Беларусь з'яўляецца адной з прыярытэтных краін у праграме інстытута “Visby”, у першую чаргу праз акадэмічныя стыпендыі, даступныя для грамадзян Беларусі. Цягам дадзенага перыяду стратэгіі прадугледжваецца пашырэнне гэтых праграм. Праграма лідэрства Шведскага Інстытута таксама прымае ўдзельнікаў з Беларусі. Акрамя таго, Швецыя фінансуе навучанне беларускіх студэнтаў у Стакгольмскай школе эканомікі ў Рызе (SSER). Больш за тое, некалькі шведскіх муніцыпалітэтаў знаходзяцца ў кантакце з беларускімі гарадамі/суполкамі–пабрацімамі, сувязі і абмены з Беларуссю падтрымліваюць і шведскія народныя рухі, палітычныя партыі і адукацыйныя аб’яднанні.

## 6. Меркаванні наконт прыярытэтаў стратэгіі

Шведская стратэгія развіцця супрацоўніцтва з Беларуссю на 2007-2010 гады ахоплівала пяць сектараў супрацоўніцтва. У святле досведу, назапашанага цягам папярэдняй працы, шведскіх перавагаў і патэнцыялу для супрацоўніцтва, а таксама прымаючы да ўвагі прыярытэты іншых донараў і бягучыя патрэбы беларускага боку, вылучэнне шведскай дапамогі ў 2011-2014 гадах будзе засяроджана на трох сектарах: I) дэмакратыя, правы чалавека і гендэрная роўнасць, II) навакольнае асяроддзе, і III) развіццё рынку. Такі выбар сектараў заснаваны на наступных меркаваннях:

### *Дэмакратыя, правы чалавека і гендэрная роўнасць*

Беларусь мае вострую патрэбу ў шырокай падтрымцы працэсаў дэмакратызацыі, абароны правоў чалавека і гендэрнай роўнасці. Шырокая падтрымка гэтага сектара асабліва важная ў перыяд, калі гэтыя каштоўнасці не паважаюцца, паколькі гэта служыць сігналам усім беларусам, гатовым да перамен, пра тое, што яны не з’яўляюцца ізаляванымі.

Ініцыятывы ў гэтым сектары – абмен досведам і падтрымка не толькі прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, актывістаў у галіне правоў чалавека, незалежных СМІ і культурнага сектара, арыентаваных на рэформы, але і, наколькі гэта магчыма, прадстаўнікоў улады, гатовых да зменаў, - важныя як у кароткатак і ў доўгатэрміновай перспектыве. Такая падтрымка дапамагае далейшаму развіццю і ўстойлівасці грамадзянскай супольнасці, здольнай абараняць правы чалавека, і таксама стварае аснову для будаўніцтва надзейнага дэмакратычнага грамадства ў доўгатэрміновай перспектыве.

Грамадзянская супольнасць мае патрэбу ў падтрымцы, каб увогуле мець магчымасць працаваць, але яна таксама мае патрэбу

і ў дапамозе ў развіцці патэнцыялу сваіх арганізацый. Міжнародныя абмены садзейнічаюць крокам у гэтым накірунку, у тым ліку і ў ідэйнай плоскасці. Грамадзянская супольнасць павінна развіваць сваю ролю голаса народа і ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў і грамадскіх абмеркаваннях. Неабходна заахвочваць доступ да незалежнай інфармацыі і сродкаў масавай інфармацыі і падтрымліваць незалежных журналістаў. Шведскі ўнёсак дапаўняецца працай іншых донараў, і важна забяспечыць, каб ўся дапамога не абмяжоўвалася некалькімі атрымальнікамі, але шукаць разнастайнасці і плюралізму.

Беларускі бок выказаў відавочную зацікаўленасць супрацоўніцтвам са Швецыяй па пытаннях гендэрнай роўнасці. Пытанні гендэрнай роўнасці пранізваюць шэраг праектаў у рамках папярэдняй стратэгіі, і перспектывы для актывізацыі мер у гэтай галіне будуць вывучацца.

***Навакольнае асяроддзе***

Асноўныя выклікі, якія стаяць перад беларускім сектарам аховы навакольнага асяроддзя, павінны вырашацца не толькі праз інвестыцыі ў скарачэнне шкодных выкідаў і больш цеснай увязкі з заканадаўствам ЕС, але і шляхам супрацоўніцтва паміж экалагічнымі арганізацыямі і ўладамі, а таксама праз забеспячэнне экалагічнай дасведчанасці і прыхільнасці, якія патрэбна развіваць на ўсіх узроўнях грамадства. Намаганні ў гэтай сферы дапамогуць прывесці сітуацыю ў Беларусі ў большую адпаведнасць з сітуацыяй у ЕС, а таксама паспрыяць ўсталяванню ролі краіны як часткі Еўропы. Усталявалась плённае супрацоўніцтва з беларускімі ўстановамі, і існуе попыт на шведскую падтрымку. Важна, такім чынам, працягваць падтрымліваць у цэнтральным апараце ўлады тых, хто выступае за змены. Мэтай шведскіх ініцыятыў з’яўляецца дапамога ў арганізацыі дыялогу і кансультацый паміж кампетэнтнымі ў галіне навакольнага асяроддзя органамі і грамадзянскай супольнасцю. Неабходна таксама ясна зазначыць, што развіццё ў гэтым сектары можа мець месца толькі ў тым выпадку, калі воля да рэформаў будзе дастаткова моцная.

Для таго, каб выканаць патрабаванні, вызначаныя ў дырэктывах ЕС, неабходны вялікія інвестыцыі, асабліва ў сферах ачысткі сцёкавых водаў, кіравання адходамі і змяншэння забруджвання паветра. Нацыянальнае заканадаўства ў гэтай галіне павінна быць прыведзена ў адпаведнасць з заканадаўствам ЕС. Інстытуцыйнае будаўніцтва і ўмацаванне патэнцыялу неабходныя на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях. Спатрэбяцца спецыяльныя меры, каб паменшыць негатыўны ўплыў краіны на навакольнае асяроддзе рэгіёну Балтыйскага мора з-за скідаў азоту, фосфару і пестыцыдаў праз прыбярэжныя Латвію, Літву і Польшчу. У прынцыпе, водазабеспячэнне, ачышчэнне сцёкавых

водаў, кіраванне адходамі і цеплазабеспячэнне – усе гэтыя сферы сутыкаюцца з адной праблемай: недахопам інвестыцый. Арганізацыйныя і фінансавыя структуры састарэлі. Цягам наступных некалькіх гадоў тарыфы павінны забяспечыць адпаведную кампенсацыю выдаткаў без датацый, каб у доўгатэрміновай перспектыве праца ў гэтых галінах была фінансвава ўстойлівай.

Неабходна ўмацоўваць здольнасць адказных у галіне навакольнага асяродзя органаў да распрацоўкі плённых праграм рэформаў, заснаваных на міжнародных абавязацельствах, а таксама ўзровень экалагічнай дасведчанасці і ангажаванасці ў грамадстве ў цэлым. З беларускага боку існуе значная зацікаўленасць у замежнай падтрымцы энергетычнай сферы і навакольнага асяроддзя. Дапамагаючы Беларусі ў гэтым сектары, Швецыя і іншыя донары будуць працягваць садзейнічаць паляпшэнню экалагічнай сітуацыі ў рэгіёне Балтыйскага мора.

***Развіццё рынку***

Намаганні ў гэтай сферы дапамагаюць стварыць умовы, неабходныя для палягчэння эканамічнага пераходу, які краіна, раней ці пазней, будзе вымушана ажыццявіць, і, тым самым, магчыма, паскараецца як пераход да рынкавай эканомікі, так і інтэграцыя з ЕС. Шведская падтрымка мае попыт з беларускага боку, таму Швецыя працягне падтрымліваць кантакты і абмены паміж шведскімі і беларускімі прадпрымальнікамі. Разам з іншымі донарамі Швецыя таксама будзе падтрымліваць рэформы ў гэтым сектары. Там, дзе такая падтрымка падасца мэтазгоднай, яна можа ўключаць захады па прывядзенні беларускага заканадаўства ў адпаведнасць з еўрапейскім.

Найсур’ёзнейшым эканамічным выклікам, з якім сутыкаецца Беларусь, з'яўляецца неабходнасць павышэння канкурэнтаздольнасці ў сферы бізнесу для прыцягнення замежных інвестыцый і скарачэння эканамічнай залежнасці ад Расіі. Асноўнымі мерамі реформаў у гэтай сувязі з'яўляюцца прыватызацыя дзяржаўных кампаній, заканадаўчая рэформа і стварэнне больш спрыяльных ўмоў для прыватнага прадпрымальніцтва. Рэформам перашкаджае двухсэнсоўнае стаўленне беларускіх уладаў да лібералізацыі эканомікі. Мэтай шведскай падтрымкі з’яўляецца дапамога ў стварэнні і ўмацаванні  суб’ектаў, якія выступаюць за змены, а таксама садзейнічанне ўсведамленню неабходнасці важных эканамічных рэформаў.

І беларускі, і шведскі бакі зацікаўленыя ў павелічэнні тавараразвароту паміж дзвюма краінамі і ў прадастаўленні шведскай дапамогі для развіцця дробнага і сярэдняга бізнесу.

REGERINGSKANSLIET

**Ministry for Foreign Affairs**
**Sweden**

103 39 Stockholm
Telephone: Int+46-(0)8-405 10 00, fax: Int+46-(0)8-723 11 76, web site: www.ud.se
Cover: Editorial Office, The Ministry for Foreign Affairs
Printed by XGS Grafisk service, 2011
Article no: UD 11.030